

Юбіляры

# Генадзь Говар

Генадзь Васільевіч Говар нарадзіўся 23 сакавіка 1945 года ў Жлобіне. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы, з якога ў 1964 годзе прызваны на вайсковую службу. Пасля дэмабілізацыі прадоўжыў вучобу ў Каўнаскім мастацкім вучылішчы і ў 1970 годзе атрымаў дыплом мастака. Працаваў на гомельскім камбінаце «Мастацтва».

Жыве ў Гомелі. Мастак, паэт. Піша на беларускай мове. Выдаў паэтычныя зборнікі «Мае абпаленыя крылы», «Мой нечаканы вершапад», «Несамгнёная ўсмешка», «Князь-возера» (паэма). Лаўрэат міжнароднай літаратурнай прэміі імя Баяна (г. Трубчэўск Бранскай вобласці) і абласнога конкурсу імя І. Мележа. Член Саюза мастакоў Беларусі, Саюза пісьменнікаў Беларусі. Удзельнічаў у выставах рознага ўзроўню, былі і персанальныя.

## Пагодкі мы

У Жлобіне, вясной, у сакавік
Я нарадзіўся. У маі — Перамога.
Пагодкі мы. Мой першы чаравік
Трымала Жлобіна дарога.
Шляхі жыцця ляглі ў далячынь.
Па тых шляхах прайшоў ужо нямала.
Але заўжды Дняпра сівога плынь
Мае ўспаміны светлыя люляла.
Мне Лёс наканаваў
вяртанне ў Жлобін,
Умацаваць у ланцугу жыцця звяно.
Праз паўстагоддзе распаліць
бацькоўскі комін
І песню спець, што ў сэрцы ўжо даўно.
Лёг на крыло, бы жураўель сівы,
Агледзеў зверху родныя прасторы,
Дняпроўскія затоны, паплавы...
Вось ён з маленства любы горад!
На правым беразе Дняпра,
Сярод лясоў, бы зубр лагодны,
У промнях сонечных святла
Зіхціць сталёвы Жлобін родны...

## Чэрвеньскі напамін

Ужо трэці год ішла вайна,
Страшэнная, сусветная, другая.
Хаўрус злачынны...
Вынікам — цана,
Такая жорсткая, такая дарагая...
Усе бачылі, як той фурункул рос
І ўрэшце рэшт прарваў
дваццаць другога:
Разгубленасць, самота і хаос...
Гіпноз пераўпэўніў засцярогу.
Крывёй мільёнаў жудасных ахвяр,
Перамаглі праклятую навалу.
Палае чэрвень —
сорак першага ліхтар
Як напамін інтэрнацыяналу...

## Вёска Ала

Штогод у студзені,
На стары Новы год
Трызніцца памяць,
Зноў Ала палае...
І жорнаў Вермахта
Жахлівы карагод
У дубняках рыпіць,
І сэрца замірае...
Амаль дзве тысячы
Бязвінных землякоў
Фашысты ў попел
Знішчылі жывымі...
Глядзяць самотна,
Стыне ў жылах кроў.
І час няўрымслівы
Не робіць іх другімі...
Штогод у студзені,
На стары Новы год
Трызніцца памяць,
Зноў Ала палае...
*(14.01.1944)*

## Сярод майстроў

З маленства самага
Жыву сярод майстроў,
Пасля вайны ўсё рабілі самі,
Сярод умельцаў —
працы песняроў
З магутнымі і лоўкімі рукамі.
Яшчэ зіма, а мой сусед не спіць,
Майструе лодку,
каб рыбаліць улетку.
Спачатку нехта
над суседам кпіць,
А потым побач
ладзіць лодку-кветку...
І вось ужо спаборнічаюць усе,
Чыя пасудзіна прызнана
будзе лепшай?
А я, хлапчук, збіраю пакрысе
Сакрэты майстраў
у гэту нізку верша...

## Роднае мінулае

Светлае мінулае,
Сумнае мінулае
Успамінам крочаць
Побач днём і ўноч...
Некалі шчаслівае,
Некалі панурае
Нашае мінулае
Побач дзень і ноч...
Скуты ці раскуты,
Стойкі ці сагнуты
З успамінам крочыць
Побач кожны з нас...
Некалі шчаслівае,
Некалі панурае
Нашае мінулае
Роднае. Сваё.

## Натхнімся ў згодзе!

Чорныя дзіры
Белымі аблокамі
Пазатыкаюцца...
Чарнобыль, з часам,
Сам-насам
Адбеліцца...
Вада забруджаная
Бялюткім пяском
Прафільтруецца...
Продкі забітыя
Нашчадкамі ў шчасці
Адновяцца...
Зло ашалелае
Згрызе карані,
Абяззубее.
І дабрачыннасць
Надзеяй у згодзе
Натхніцца...